# “Эканамічная сфера грамадства”: урок грамадазнаўства (10 клас)

**В. А. Тарасевіч,**
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі,
Калачаўскай СШ Лагойскага раёна

Сучаснае жыццё людзей не можа існаваць без эканамічных каштоўнасцей. Але не ўсе ведаюць, як правільна іх. У гэтым дапамагаюць веды ў сферы эканомікі.

**Мэта**: паўтарэнне, абагульненне і замацаванне вучэбнага матэрыялу па разделе грамадазнаўства “Эканамічная сфера грамадства”.

**Задачы:**

Паўтарэнне і замацаванне асноўных эканамічных паняццяў.

Фарміраванне ключавых кампетэнцый, неабходных для жыццядзейнасці ў сферы эканомікі.

Развіццё ў вучняў уменняў абмяркоўваць эканамічныя пытанні.

**Абсталяванне:** карткі з заданнямі, назвы каманд.

**Ход урока**

**I.Арганізацыйна-матывацыйны этап.** Настаўнік вітае вучняў. Правярае падрыхтаванасць да ўрока. Пералічвае сітуацыі, якія адбываюцца ў жыцці кожнага. Гэта паездка ў грамадскім транспарце, дамашні абед, урок грамадазнаўства ў школе, размова па тэлефоне, прымерка адзеня ў магазіне, візіт да стаматолага, прагулка ў парку, прагляд спектакля ў тэатры. Задавальненне дадзеных патрэб даследуе эканамічная навука.

Мы пазнаёміліся на ўроках грамадазнаўства, як правільна карыстацца сістэмай Tax Free, што такое гіперінфляцыя, а зараз праверым вашы веды па раздзеле “Эканамічная сфера грамадства”.

Настаўнік тлумачыць правілы гульні. Прапаноўвае пытанні па вывучаных тэмах. Вучні сумесна абмяркоўваюць, абгрунтоўваюць і самастойна вызначаюць, хто правільна адказаў. За кожны верны адказ атрымліваюць 1 бал. Настаўнік дапаўняе і канкрэтызуе, карэкціруе, а таксама запісвае колькасць набраных балаў. Калі пытанні вучням пададуцца складанымі і невырашальнымі, можна выкарыстаць інтэрактыўныя падказкі: малюнкі, графікі, інфаграфікі, відэа-, аўдыяматэрыял, які настаўнік рыхтуе загадзя. Акрамя таго, вучні маюць права самастойна выбраць тэму для адказаў.

**II.Асноўны этап.** Вучні запаўняюць пропускі, аргументуюць пытанні па тэме **“Эканоміка і яе роля ў жыцці чалавека”.**

1. Ксенафонт упершыню выкарыстоўвае паняцце “эканоміка” ў працы “__________”. *(Дамастрой. Могуць дапоўніць ведамі пра кнігу “Дамастрой” у Расіі, створаную ў часы Івана Грознага.)*

2. Паняцце эканоміка мае ______________паходжанне. *(Грэчаскае паходжанне. Ксенафонт жыў у перыяд Антычнасці на тэрыторыі Грэцыі. Літаральна перакладаецца “кіраванне асабістай гаспадаркай”. )*

3. Назавіце фазы вытворчасці. *(Вытворчасць, размеркаванне, абмен, спажыванне.)*

4. Назавіце “спецыфічныя рэсурсы”. *(Інфармацыя, веды, уменні, прафесійныя навыкі і інш.)*

5. Эканамічныя рэсурсы і фактары вытворчасці, у чым розніца? *(Эканамічных рэсурсаў шмат, але тая частка іх, якая непасрэдна ўключаецца ў працэс вытворчасці, называецца фактарамі вытворчасці.)*

6. Пералічыце прыродныя рэсурсы, якія нельга прадаць або купіць. *(Паветра.)*

7. Домагаспадарка – гэта суб’ект або аб’ект? *(Домагаспадарка – гэта суб’ект эканомікі, які складаецца з аднаго чалавека або группы людзей (сям’і), якія пражываюць сумесна, вядуць агульную гаспадарку з выкарыстаннем наяўных рэсурсаў.)*

8. Як называецца эканамічная сістэма, пры якой дзяржава валодае сродкамі вытворчасці, дырэктыўна размяркоўвае матэрыяльныя сродкі, цэнтралізавана арганізоўвае планаванне? *(Планавая эканоміка.)*

**Пытанні па тэме "Уласнасць і даходы"**

9. Вызначце, што з дадзеных паняццяў будзе адносіцца да даходаў: зарплата, рэнта, працэнт, роялці, прыбытак. *(Да даходаў адносяцца зарплата, рэнта, працэнт, роялці, прыбытак.)*

10. Як называецца форма аплаты працы, пры якой заработная плата разлічваецца на аснове колькасці выробленай прадукцыі? *(Здзельная.)*

11. Ці могуць называцца трансфертамі пенсіі, стыпендыі, грашовая дапамога? *(Да.)*

12. Што такое раздзяржаўленне эканомікі? *( Гэта працэс змяншэння ролі дзяржавы ў непасрэдным кіраванні эканамічнымі аб'ектамі. Раздзяржаўленне ажыццяўляецца пры дапамозе разнастайных механізмаў, у тым ліку шляхам прыватызацыі.)*

13. БПМ – гэта _________. *(Бюджэт пражытачнага мінімуму – кошт мінімальнага набору матэрыяльных даброт і паслуг, неабходных для забеспячэнне жыццядзейнасці чалавека і захавання яго здароўя.)*

14.БПМ зацвярджаецца пастановай Савета Міністраў раз у _________. *(Раз у квартал.)*

**Пытанні па тэме "Грашова-крэдытная сістэма"**

15. Растлумачце, што такое сімвалічныя, наяўныя і безнаяўныя грошы. *(Сімвалічныя – наяўныя і безнаяўныя грошы, наяўныя – металічныя і папяровыя грошы, безнаяўныя грошы ўяўляюць сабой запісы на рахунках у банку.)*

16. Функцыі грошай. *(Мера кошту, сродак абарачэння, сродак плацяжу, сродак зберажэння і накаплення, сусветныя грошы.)*

17. Высакародныя металы. *(Золата і серабро.)*

18. Кэшбэк – гэта______. *(Прыбытак.)*

19. Колькі відаў аперацый выконваюць універсальныя банкі? *(Ад 100 да 300.)*

20. Банк – гэта ______. *(італ. bancо – лава, крама мянялы) – фінансавая ўстанова, якая спецыялізуецца на накапленні грашовых сродкаў, крэдытаванні, пасрэдніцтве ў грашовых разліках і аперацыях з каштоўнымі паперамі.)*

21. Інфляцыя – гэта________. *(лац. inflatio – уздуцце) – абясцэньванне грошай, выкліканае перавышэннем колькасці грошай, што знаходзяцца ў абарачэнні над іх таварным перакрыццём.)*

22. Дэпазіт – гэта ________. *( Банкаўскі ўклад.)*

23. Што такое блокчэйн? *(Пабудаваны па пэўных правілах бесперапынны паслядоўны ланцужок блокаў, якія змяшчаюць інфармацыю. Часцей за ўсё гаворка ідзе пра транзакцыі ў розных крыптавалютах, але блокі могуць утрымліваць і іншую інфармацыю. Упершыню назва з’явілася як размеркаваная база даных, рэалізаваная ў сістэме «Біткойн».)*

24. Крыптавалюта – гэта_______. *(Разнавіднасць лічбавай валюты, улік унутраных разліковых адзінак якой забяспечвае дэцэнтралізаваная плацёжная сістэма (няма ўнутранага або знешняга адміністратара або якога-небудзь яго аналага, якая працуе ў цалкам аўтаматычным рэжыме.)*

25. Ці вядзе Нацыянальны Банк РБ крэдытны рэгістр? *(Да.)*

**Пытанні па тэме “Рынак: попыт, прапанова, цана”**

26. Хто напісаў кнігу “Даследаванне аб прыродзе і прычынах багацця народаў”? *(Адам Сміт.)*

27. Што значыць метафара “Нябачная рука”? *(Метафару “нябачная рука” у першыню выкарыстаў шатландскі эканаміст Адам Сміт. Ён лічыў, што вытворцы ў першую чаргу кіруюцца ўласнымі інтарэсамі, пры гэтым, яны нябачнай рукой накіроўваюцца да мэты і такім чынам служаць усяму грамадству. Вытворцы паляпшаюць вытворчасць, зніжаюць цэны, каб прыцягнуць пакупнікоў.)*

**Пытанні па тэме “Фінансавая сістэма грамадства”**

28. З якога года Беларусь падтрымлівае сістэму Tax Free. Гэта сістэма вяртання замежным грамадзянам ПДК. *(2013 года.)*

29. ПДК – гэта _____. *(Падатак на дабаўлены кошт выплачваецца з так званага дабаўленнага кошту (рыначны кошт прадукцыі, выраблены фірмай, за вылікам кошту спажытых сыравіны і матэрыялаў, набытых ёю ў пастаўшчыкоў.)*

30. Якія ўмовы вяртання замежным грамадзянам ПДК? *(Сістэма вяртання распаўсюджваецца на асоб, якія не пражываюць пастаянна ў Беларусі і краінах Еўразійскага эканамічнага саюза. Вяртанне робіцца з цаны тавараў, што абкладаюцца 20% ПДК, пры ўмове куплі на пэўную суму ў гандлёвым аб’екце, падключаным да сістэмы Tax Free, на працягу аднаго працоўнага дня. Сістэма вяртання не распаўсюджваецца на прадукты са стаўкай ПДК 10 %.)*

31. Што такое акцыз? *(Гэта ўскосны падатак, выплачваецца апасродкавана шляхам уключэння ў цану тавараў і паслуг. Як правіла, гэта падатак на спажыванне пэўных тавараў: транспартныя сродкі, паліва, спіртныя напоі, тытунёвыя вырабы і г.д.)*

**Пытанні па тэме “Дзяржава і эканоміка”**

32. Назавіце від інфляцыі пры якой узровень інфляцыі дасягае 200% за год. *(Па тэмпе росту – галапіруючая.)*

33. Назавіце від інфляцыі, пры якой узнікае дэфіцыт тавараў. *(Па форме праяўлення – скрытая.)*

34. Дзе была выпушчана самая вялікая па намінале банкнота (1 мільярд трыльёнаў)? *(У Венгрыі ў 1946 г., калі краіна перажывала самы высокі ўзровень інфляцыі за ўсю гісторыю грашовага абарачэння ў свеце.)*

35. Што такое дэнамінацыя? *(ад лац. denominatio – перайменаванне, змяненне намінальнай вартасці грашовых знакаў.)*

36. Калі на тэрыторыі Беларусі была праведзена замена грашовых сродкаў? *(У 2000 і 2016 гадах.)*

37. Фрыкцыйнае, сезоннае, структурнае, цыклічнае – гэта _______? *(Віды беспрацоўя.)*

38. Выплата дапамогі па беспрацоўі – гэта актыўная дапамога дзяржавы або пасіўная? *(Пасіўная, да яе яшчэ адносіцца прадастаўленне магчымасці знайсці новае працоўнае месца праз дзяржаўныя органы па пытаннях занятасці. Актыўная палітыка носіць папераджальны характар, накіравана на зніжэнне беспрацоўя да яго мінімальнага ўзроўню. Асноўнымі інстументамі з'яўляюцца прафесійная падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў, грамадскія работы, арганізацыя часовай занятасці, садзейнічанне развіццю прадпрымальніцтва і інш. )*

39. Забяспечанасць людзей матэрыяльнымі дабротамі – гэта ўзровень жыцця або якасць жыцця? *(Узровень жыцця. Якасць жыцця з'яўляецца больш шырокім паняццем і ўключае не толькі эканамічныя параметры, але і доступ да якаснай адукацыі, аховы здароўя, стан навакольнага асяроддзя, задавальненне духоўных патрэб, псіхалагічны камфорт.)*

40. Стан навакольнага асяроддзя – гэта ўзровень жыцця або якасць жыцця? *(Якасць жыцця.)*

**III.Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.**

Калі вучні набіраюць больш за 30 балаў, то атрымліваюць адзнаку 10; 20-25 балаў – адзнаку 9; 15-20 балаў – адзнаку 8; 10-14 правільных адказаў – адзнаку – 7 і г.д.

**IV.Рэфлексія “Астравы”**

На магнітнай дошцы замацоўваюцца выявы астравоў з наступнымі назвамі: в. Накаплення ведаў, в. Прыбытку, в. Банкроцтва, в. Поспеху, в. Творчасці, в. Добрага настрою, в. Актыўнасці, в. Пасіўнасці, в. Плённай працы. Вучні выбіраюць любы з астравоў, які характарызуе іх настрой на ўроку.